**Крытэрыі ацэнкі конкурсу “Водгук на мастацкі твор”**

*Максімальная колькасць балаў — 30*

| | |
|---|---|
| **I. Уменне выяўляць асноўную тэматыку і праблематыку твора (2 балы)** | |
| 2 б. | правільнае разуменне тэмы і праблемы твора, дакладнае вызначэнне і абгрунтаванне |
| 1 б. | няпоўнае разуменне тэмы і праблемы твора, недастаткова поўнае асвятленне аўтарскай пазіцыі |
| 0,5 б. | прыблізнае разуменне тэмы і праблемы твора, выяўленне асноўных спосабаў раскрыцця аўтарскай пазіцыі |
| **II. Уменне абгрунтоўваць прачытанае (6 балаў)** | |
| 6 б. | дакладнае і вычарпальнае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора; наяўнасць чытацкага вопыту (звесткі пра аўтара, паралелі з іншымі творамі, спасылкі на іншых аўтараў, цытаты, уласныя паэтычныя радкі і інш.); дарэчнасць ілюстрацыйнага матэрыялу, яго дакладнасць, доказнасць, мэтазгоднасць. Эфектыўнасць |
| 4-5 б. | наяўнасць цікавых назіранняў над творам, пэўнага чытацкага вопыту, эпізадычнае абгрунтаванне ўласных высноў са спасылкай на тэкст і творы іншых аўтараў |
| 3б.- | ацэнка асобных (2-3) аўтарскіх перакананняў, думак, развражанняў; частковае абгрунтаванне ўласнага прачытання твора |
| 2б. | наяўнасць асобных цікавых назіранняў над творам без прывядзення неабходнай аргументацыі да іх |
| 1 б. | канстатацыя арыгінальнасці прачытанага, але адсутнасць доказаў, наяўнасць фактычных, лагічных памылак у аргументацыйнай частцы, абмежаваны чытацкі вопыт, недакладнасць, спрошчанасць сасбістай [illegible] |
| III. **Уменне вызначаць ролю сюжэта, кампазіцыі, выяўленчых сродкаў выразнасці (7 балаў)** | |
| 7 б. | дакладнае вызначэнне кампазіцыі твора, яго сюжэтных ліній, вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці і іх цікавая, арыгінальная інтэрпрэтацыя |
| 5-6 б | нязначныя недахопы ў інтэрпрэтацыі вобразных сродкаў і структуры тэксту |
| 4 б. | наяўнасць нешматлікіх (1-2) памылак у вызначэнні і інтэрпрэтацыі кампазіцыі твора, сюжэтных ліній, вобразаў, выяўленчых сродкаў |
| 3 б. | інтэрпрэтацыя асобных элементаў тэксту |
| 2 б. | павярхоўнае бачанне ролі сюжэта, кампазіцыі, вобразаў, мастацкіх сродкаў выразнасці ў раскрыцці тэмы і ідэі твора; недакладнасці ў вызначэннях |

| | |
|---|---|
| 1 б. | пералічэнне выяўленчых сродкаў без абгрунтавання іх ролі ў мастацкім творы |
| **IV. Моўнае і кампазіцыйнае афармленне водгуку (3 балы)** | |
| 3б. | прадуманасць кампазіцыі (адпаведнасць кампазіцыі водгуку асаблівасцям тыпу і жанру маўлення), багацце, разнастайнасць моўных сродкаў, дакладнасць словаўжывання |
| 2б. | нязначныя парушэніі кампазіцыйных частак, асобныя недахопы моўнага выражэння |
| 1б. | парушэнне жанравай цэласнасці водгуку, яго структурных (адсутнасць уступу або заключэння) і стылістычных патрабаванняў; парушэнне лагічнай сувязі кампазіцыйных частак, іх несуразмернасць; недахопы моўнага выражэняя беднасць слоўнікавага запасу, русізмы, калькі, моўныя штампы) |
| V. **Пісьменнасць па крытэрыях ацэнкі творчых работ вучняў (10 балаў)** | |
| 1 | больш, як на 2 балы |
| 2 | ад 7/2 да 10/1 і 10 граматычных памылак |
| 3 | 0/8, 1/7, 2/6, 3/5, 4/4, 5/3, 6/2, 7/1 і 7 граматычных памылак |
| 4 | 0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/0, 6/1, і 6 граматычных памылак |
| 5 | 0/6,1/5, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 і 5 граматычных памылак |
| 6 | 0/5, 1/4, 2/3,3/2, 4/0, 4/1 і 4 граматычныя памылкі |
| 7 | 0/4, 1/3, 2/1, 2/2, 3/0, 3/1 і 3 граматычныя памылкі |
| 8 | 2/0, 1/1, ½, 0/2, 0/3 і 2 граматычныя памылкі або 3 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 9 | 1/0, 0/1 і 1 граматычная памылка або 1-2 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| 10 | 0/0, 1/0 (нягрубая), 0/1 (нягрубая), 1-2 выпраўленні не на месцы арфаграм (пунктаграм) |
| **VI. Творчы характар работы (2 балы)** | |
| 2 б. | арыгінальнасць трактоўкі, якая не пярэчыць сутнасным характарыстыкам мастацкага твора; дакладнасць, навуковы кругагляд, наяўнасць нестандартнай формы, яе мэтазгоднасць, эфектыўнасць пры дасягненні пастаўленых камунікатыўных задач |
| 1 б. | наяўнасць асобнага(ых) цікавага(ых) назірання(яў), гісторыка-культурных параўнанняў, паралеляў з іншымі творамі; спрошчанасць, традыцыйнасць высноў; немэтазгоднасць абраных сродкаў і формы для вырашэння пастаўленых камунікатыўных задач |